**ПАХО́М**, прысвятак народнага календара. Адзначаўся 28 мая н.ст. У гэты дзень дазвалялася ўсё рабіць, але, паколькі ён лічыўся агародным святам, то абавязкова раілі высаджваць агуркі, бо, пасеяныя менавіта ў гэты дзень, яны абяцалі даць добры ўраджай: «Пасееш агуркі, калі Пахом, то будзеш насіць (збярэш) мяхом». Чакалася пацяпленне: «Пахом павее цяплом». У некаторых мясцовасцях забаранялася працаваць, каб улетку не было граду.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 452.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ